САКРЭТ ПОСПЕХАЎ — У ЗНІЖЭННІ ВЫДАТКАЎ

*** Газавая гаспадарка на Гомельшчыне пачала актыўна развівацца яшчэ з 60-х гадоў мінулага стагоддзя. На Палессе прыроднае «блакітнае паліва» пачало паступаць толькі ў 1990-я гады. Менавіта тады яно пачало паступова і ўпэўнена замяняць звадкаваны газ.**

У Рэспубліканскім вытворчым ўнітарным прадпрыемстве «Гомельаблгаз» філіял ВУ «Мазыргаз» па выніках мінулага года з'яўляецца адным з самых паспяховых. Узначальвае яго **дырэктар Віктар ПЯНЬКО**:

— «Мазыргаз» сёння мае падраздзяленні ў Ельску, Нароўлі, Лельчыцах і Калінкавічах. Прычым у апошнім населеным пункце ёсць і газанапаўняльная станцыя. Мазырскі філіял — адно з вядучых прадпрыемстваў газавай галіны Гомельшчыны, якое лідзіруе па многіх пазіцыях. Асноўнае наша дасягненне ў тым, што летась мы спрацавалі без аварый. Газазабеспячэнне спажыўцоў прыродным і звадкаваным газам было бесперабойным. Выпадкаў вытворчага траўматызму і парушэнняў рэжыму работы газаразмеркавальнай сістэмы не адбылося. Увогуле ўдала год склаўся. Усе вытворчыя і эканамічныя паказчыкі выканалі. У кожным раёне газазабеспячэння мы зрабілі мадэрнізацыю. «Мазыргаз» праводзіць актыўную работу па газіфікацыі аграгарадкоў і населеных пунктаў у сельскай мясцовасці. Летась у Ельскім раёне па Чарнобыльскай праграме пачалося будаўніцтва газаправода да аграгарадка Скароднае. Мы завяршалі мінулы год здачай першай чаргі гэтага аб'екта. Сёлета прыступім да другой — будзем газіфікаваць непасрэдна гэты населены пункт. Плануем будаваць газаправод у Калінкавіцкім раёне — да вёсак Крукавічы і Ператрутаўскі Варатын, каб потым газіфікаваць гэтыя населеныя пункты.

Цяпер на Палессі дзейнічае надзейная сістэма бесперабойнага забеспячэння прыродным і звадкаваным газам. Сёння працягласць газавых сетак, якія абслугоўвае «Мазыргаз», складае больш чым паўтары тысячы кіламетраў. З іх толькі 9,5 км прыходзяцца на звадкаваны газ. Большую частку (93,7 %) агульнага аб'ёму рэалізаванага прыроднага газу спажываюць прамысловыя прадпрыемствы, і толькі каля 6 % — насельніцтва.

Сучаснае прадпрыемства праводзіць пастаянную мадэрнізацыю вытворчасці, укараняе энергазберагальнае абсталяванне. На працягу шэрагу гадоў упраўленне арганізоўвае бесперабойны і безаварыйны працэс выканання ўсіх мерапрыемстваў па забеспячэнні рэгіёна як звадкаваным, так і прыродным газам. «Мазыргаз» падае паліва да 140 прадпрыемстваў і арганізацый, а таксама да 111 тысяч кватэр. Пры гэтым звадкаваным газам карыстаецца крыху больш за чвэрць насельніцтва падпарадкаванай тэрыторыі.

Летась атрымалася павялічыць колькасць тых, хто аддаў перавагу «блакітнаму паліву». Тэмп росту да ўзроўню мінулага года склаў 107,7 %.

— Жыхары паспяхова вучацца эканоміць, — заўважае Віктар Аляксандравіч. — Прагнозны паказчык па абсталяванні кватэр і дамоў грамадзян прыборамі ўліку расходу газу за мінулы год выкананы на 110,7 %. Сталі пільна сачыць за тым, колькі скарысталі паліва, жыхары больш чым 2200 кватэр і дамоў. Выканана таксама заданне па эканоміі паліўна-энергетычных рэсурсаў. Пры плане мінус 2,9 % яго фактычнае значэнне склала мінус 4,4 %.

Калінкавіцкая газанапаўняльная станцыя.

Значная ўвага ў працы ўпраўлення на працягу 2017 года ўдзялялася пытанням зніжэння выдаткаў, рацыянальнаму расходванню матэрыяльных і фінансавых сродкаў. У межах выканання патрабаванняў Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб мерах па павышэнні эфектыўнасці сацыяльна-эканамічнага комплексу Рэспублікі Беларусь» у галаўным прадпрыемстве РВУП «Гомельаблгаз» распрацаваны і зацверджаны план мерапрыемстваў па зніжэнні выдаткаў і павышэнні эфектыўнасці выкарыстання матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў. Адпаведна, вытворчым упраўленнем «Мазыргаз» летась была зацверджана праграма з гадавым заданнем забяспечыць эканамічны эфект у суме 79,8 тысячы рублёў. Яе рэалізацыя была даведзена ўсім структурным падраздзяленням. На прадпрыемстве штомесяц праводзяцца сходы працоўнага калектыву па падвядзенні вынікаў гэтай работы — з афармленнем адпаведных пратаколаў.

Дарэчы, упраўленне штогод забяспечвае зніжэнне выдаткаў на вытворчасць прадукцыі (работ, паслуг) за кошт рэалізацыі мерапрыемстваў па энергазахаванні, аптымізацыі і скарачэнні нормаў выдатку паліўна-энергетычных, матэрыяльных і працоўных рэсурсаў. Фактычна за мінулы год упраўленнем дасягнуты эканамічны эфект 113,7 тысячы рублёў.

— Гэтага атрымалася дабіцца за кошт правядзення мерапрыемстваў па зніжэнні выдаткаў на рамонтна-эксплуатацыйнае абслугоўванне і трыманне асноўных сродкаў, — адзначае Віктар Пянько. — Таксама мы змаглі знізіць выдаткі на ўтрыманне аўтатранспарту і механізмаў: скарацілі спажыванне светлых нафтапрадуктаў да нарматыўнага, узмацнілі жорсткасць нарматываў прабегу і выдаткаў на ўтрыманне аўтатранспарту, замянілі аўтамабілі на менш энергазатратныя, перавялі аўтатранспарт на выкарыстанне звадкаванага газу і гэтак далей. Былі праведзены мерапрыемствы па скарачэнні выдаткаў за кошт удасканалення арганізацыі і аплаты працы. Мы палепшылі ўмовы працы спецыялістам, якія працуюць у шкодных умовах. Увогуле ж работа па зніжэнні выдаткаў і павышэнні эфектыўнасці выкарыстання матэрыяльных рэсурсаў будзе актыўна працягнута і сёлета.

Вялікая частка працы газавікоў — аказанне паслуг насельніцтву. Людзі даўно прызвычаіліся да прынцыпу «адно акно». Ён стаў нормай жыцця і для работы абаненцкага аддзела. З 2006 года па Указе № 368 чалавек можа скарыстацца істотнымі льготамі па газіфікацыі: 70 % дзяржаўнай падтрымкі атрымліваюць жыхары населеных пунктаў з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек, 30 % — гарадскія, а на астатнюю частку сумы можна скарыстацца льготным крэдытам. Час паказаў, што такая падтрымка істотная і вельмі эфектыўная.

*** Прыродны газ — не толькі эканамічна эфектыўнае, але і экалагічна чыстае паліва. На землях, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС, альтэрнатывы газу насамрэч няма — гэта самы чысты з магчымых рэсурсаў.**

Уладальнікі тэхнікі імкнуцца да пераходу аўтамабіляў на газавае паліва, бо яно значна таннейшае. Да таго ж упраўленне ажыццяўляе паслугі па пераабсталяванні аўтамабіляў для працы на звадкаваным газе.

— На абслугоўванні службы ўнутрыдамавых газавых сістэм і абсталявання знаходзіцца амаль 110 тысяч газавых пліт, каля 11 тысяч праточных водагравальнікаў і звыш 14,5 тысячы аціпляльных апаратаў і катлоў, — расказвае **галоўны інжынер філіяла Уладзімір ГРАМОВІЧ.** — Нягледзячы на

добра адладжаны механізм прафілактыкі, ніколі нельга выключаць узнікненне няштатных сітуацый. Арганізацыю рашэння такога роду задач бярэ на сябе аварыйна-дыспетчарская служба, якая заўсёды напагатове для аператыўнай лакалізацыі і ліквідацыі магчымых няштатных сітуацый. Для гэтага арганізавана кругласутачнае дзяжурства аварыйных брыгад, якія адразу ж рэагуюць на экстранныя выклікі па нумары 104.

Для павышэння якасці абслугоўвання сістэм газазабеспячэння праводзіцца работа па замене запорна-рэгулюючай арматуры і аб'ектаў газаразмеркавальнай сістэмы з адпрацаваным тэрмінам эксплуатацыі. Так за мінулы год заменена 12 адзінак запорна-рэгулюючай арматуры, зроблена замена васьмі аб'ектаў газаразмеркавальнай сістэмы. Таксама зроблена мадэрнізацыя абсталявання прамежкавага газарэгулятарнага пункта-2 у Калінкавічах і мадэрнізацыя чатырох групавых ёмістых установак у пасёлку Зашыр'е Ельскага раёна. Зроблена прыборнае тэхнічнае абслугоўванне 110 км падземнага газаправода, у тым ліку абследаванне тэхнічнага стану 5,4 км падземных газаправодаў, якія выпрацавалі тэрмін службы. У межах мадэрнізацыі газаразмеркавальнай сістэмы зроблена тэлемеханізацыя шасці групавых ёмістых установак, чатырох шафавых рэгулятарных пунктаў, чатырох станцый катоднай аховы. Сёлета запланавана тэлемеханізацыя 32 шафавых рэгулятарных пунктаў.

Для ўдасканалення тэхнічнага абслугоўвання ўсталяваны дыстанцыйны дэтэктар уцечак метану на адлегласці да 30 м. Летась завершана работа па мадэрнізацыі навучальных класаў з усталёўкай газавыкарыстоўваючага абсталявання ва ўсіх раёнах газазабеспячэння. Гэта зроблена для правядзення інструктажоў спажыўцоў па бяспечным карыстанні газам. Акрамя таго, за апошнія два гады выкананы значныя работы па мадэрнізацыі абсталявання Калінкавіцкай газанапаўняльнай станцыі: заменена 152 адзінкі абсталявання і арматуры. На электронную ўсталёўку напаўнення балонаў заменена механічная карусель, якая адпрацавала нарматыўны тэрмін. Уведзена ў эксплуатацыю электронная ўсталёўка напаўнення балонаў у комплексе з абсталяваннем па тэрмаусаджванню пластыкавай кантрольнай плёнкі на запорныя клапаны газавых балонаў FAS-23169 і праверкі герметычнасці вентыля бытавых балонаў FAS-23110. Гэта дазволіла ўвесці не толькі на газанапаўняльнай станцыі, але і ў вытворчых упраўленнях нумарны ўлік пломбаў і скараціць выдаткі на іх набыццё, а таксама павялічыць адказнасць спажыўцоў пры дастаўцы і вяртанні балонаў са звадкаваным углевадародным газам, і абмежаваць магчымасць перадачы іх трэцім асобам.

Зараз на ВУ «Мазыргаз» плённа працуюць звыш 500 чалавек. Сярэднямесячная заработная плата работнікаў летась ўзрасла. Кожны работнік можа павялічыць заробак за кошт свайго прафесійнага майстэрства.

Кадры, вядома ж, вырашаюць усё. Дакладней — іх кваліфікацыя. Таму на прадпрыемстве аддаецца вялікая ўвага навучанню работнікаў. Летась павысілі кваліфікацыю больш як 280 газавікоў. Многія з супрацоўнікаў атрымліваюць адукацыю ў вышэйшых навучальных установах завочна. Пастаянна вядзецца перападрыхтоўка спецыялістаў.

Лепшая брыгада АДС 2015: Слесар Уладзімір БАБОВІК, майстар Дзмітрый КУЛАГА, галоўны інжынер Уладзімір ГРАМОВІЧ, кіроўца Вадзім ЛІСОЎСКІ.

Прафесіяналізм супрацоўнікаў «Мазыргаза» пацверджаны не толькі кіламетрамі пракладзеных газаправодаў і бездакорнай эксплуатацыяй аб'ектаў газавай гаспадаркі. Яшчэ і ўдзелам у конкурсах-аглядах прафесійнага майстэрства «Найлепшы па прафесіі». Летась мазырская каманда ў складзе майстра Аляксандра Халмякова і слесараў Алега Папова і Дзмітрыя Васіленкі стала пераможцай у рэспубліканскім конкурсе па прафесійным майстэрстве на званне «Найлепшая брыгада па тэхнічным абслугоўванні ўнутрыдамавога газавага абсталявання». Ну а слесар службы ўнутрыдамавых газавых сістэм і абсталявання (Калінкавіцкі РГЗ) Дзмітрый Васіленка — яшчэ і ўладальнікам персанальнай намінацыі «Найлепшы слесар па тэхнічным абслугоўванні імпартнага абсталявання». Такім чынам, мазыране прадэманстравалі тэарэтычныя веды, паказалі высокую тэхнічную базу, а таксама падмацавалі ўменні і прафесіяналізм на практыцы.

Калектыў упраўлення жыве актыўным працоўным і грамадскім жыццём. Штогод арганізуюцца агляды мастацкай самадзейнасці. Цікавасць да спорту стварае атмасферу ўзаемадапамогі, сяброўства і адзінства. Гэта немалаважны фактар у фарміраванні ўзаемаадносін. Прычым узроставага бар'ера не існуе. Газавікі «Мазыргаза» з'яўляюцца не толькі актыўнымі ўдзельнікамі спаборніцтваў, якія праводзяцца ў самім калектыве, але і гарадскіх, абласных спаборніцтваў па зімовых і летніх відах спорту. Урэшце інвестыцыі ў спорт і здаровы лад жыцця вяртаюцца і станоўча адбіваюцца на прадукцыйнасці працы.

На прадпрыемстве створаны паўнавартасныя ўмовы для працы і адпачынку. Вялікую работу ў гэтым кірунку праводзіць прафсаюзная арганізацыя, якая абараняе інтарэсы супрацоўнікоў, стымулюе іх працу яшчэ і праз сацыяльныя выплаты. Не забываюць у калектыве ветэранаў, пенсіянераў, інвалідаў, шматдзетныя сем'і... Выплаты «на агародніну», як і матэрыяльная дапамога на аздараўленне, да свят, на харчаванне, узнагарода па выніках працы за год, матэрыяльная дапамога да Новага года сталі пастаяннымі.

— Сёлета мы будзем удзяляць спецыяльную ўвагу стану дэбіторскай запазычанасці за выкананыя работы і аказаныя паслугі юрыдычным і фізічным асобам, — адзначае Віктар Пянько. — Плануем забяспечыць выкананне даведзеных каштарысаў выдаткаў на прыродны і звадкаваны газ. Комплекс мерапрыемстваў па тэхнічным абслугоўванні і рамонце сістэмы газазабеспячэння — таксама актуальная задача. Працягнем зніжэнне выдаткаў і павышэнне эфектыўнасці выкарыстання матэрыяльных рэсурсаў. Будзем імкнуцца да павелічэння аб'ёмаў паслуг насельніцтву і юрыдычным асобам з рэнтабельнасцю не ніжэй за 5 %. Традыцыйнымі нашымі задачамі з'яўляецца стварэнне бяспечных умоў працы персаналу і зніжэнне адмоўнага ўздзеяння шкодных і небяспечных фактараў на навакольнае асяроддзе. Мы будзем рабіць усё магчымае, каб гарантаваць устойлівае, безаварыйнае газазабеспячэнне ўсіх суб'ектаў гаспадарання. Нашы досвед, веды і прафесіяналізм з'яўляюцца залогам стабільнасці і эканамічнага росту.

УНП 400035057